ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
31
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 12 (1388)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

для выпускнікоў школ быў арганізаваны на філалагічным факультэце. Школьнікі сустрэліся з кіраўніцтвам, вучонымі і выкладчыкамі факультэта. Перад школьнікамі выступілі намеснік дэкана М. М. Піпчанка, дацэнт С. А. Лысенка, сакратар партбюро факультэта В. П. Рагойша, намеснік старшыні прафбюро У. А. Навумовіч, а таксама студэнты Т. Баркун, І. Кратовіч. Былі арганізаваны экскурсія па факультэту, сустрэчы на кафедрах, выступленне факультэцкай агітбрыгады.

Т. СОТЧАНКА,
сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.

## ТЫДЗЕНЬ ДРУЖБЫ

паміж савецкімі і в'етнамскімі студэнтамі прайшоў на механіка-матэматычным факультэце. У яго праграме — спаборніцтвы па валейболу, культпаходы ў тэатр, кіно. В'етнамскія студэнты сустрэліся са школьнікамі Мінска і расказалі аб сваёй радзіме, гераічнай барацьбе в'етнамскага народа супраць захопнікаў.

ТУАН ФОНГ,
студэнт факультэта журналістыкі.

## ДАГАВОР АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

паміж камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна і зямляцтвамі студэнтаў з Малагасійскай Рэспублікі, Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Йемен і Йеменскай Арабскай Рэспублікі быў падпісаны нядаўна ва універсітэце.

Пры падпісанні дагавора была падкрэслена неабходнасць развіцця новых форм сумеснай работы.

А. КІСЯЛЁВА,
член інтэрпрэс-цэнтра.

## АДКРЫТЫ ПРАГЛЯД

літаратуры па тэме «Трыумф ленінскіх ідэй дружбы народаў і пралетарскага інтэрнацыяналізму» правёў аддзел навуковай і мастацкай літаратуры бібліятэкі.

На праглядзе былі прадстаўлены кнігі па наступных раздзелах: пралетарскі інтэрнацыяналізм і наша сучаснасць; непарушны брацкі саюз; Савецкі Саюз — надзейная апора міру і дружбы народаў планеты.

Ф. МІРУШЧАНКА,
супрацоўніца бібліятэкі.

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

## ШЛЯХ ДА МАРЫ

*ГЭТА ТАНЯ ДЗЕНІСЮК. У свае дваццаць яна паспела з залатым медалём закончыць сярэднюю школу, паступіць на геаграфічны факультэт універсітэта. Цяпер Таня займаецца на чацвёртым курсе, марыць стаць настаўніцай.*

*Любоў да гэтай прафесіі прыйшла да яе, напэўна, тады, калі трапіла ёй у рукі кніга акадэміка Фёдарава пра палярнікаў, і загарэлася дзяўчына жаданнем захапляючых падарожжаў. Або пазней, калі дзесяцікласніца Таня Дзенісюк цэлы тыдзень вяла ў шостым класе геаграфію. Але як бы там ні было, дакументы Таня падала на геаграфічны.*

*А каб мара яе збылася, рашыла дзяўчына вучыцца толькі на добра і выдатна. І слова сваё пакуль што трымае: у яе залікоўцы толькі адна чацвёрка. «Крыху пераацаніла сябе»,— гаворыць. Але гэта, здаецца, ад сціпласці.*

*Калі вы думаеце, што Таню можна пасля заняткаў застаць толькі ў чытальнай зале, схіленай над падручнікамі, дык глыбока памыляецеся. Яна ўсюды паспявае: і да практычных падрыхтавацца, і ў тэатр схадзіць, і кнігу цікавую прачытаць.*

*А яшчэ Таня Дзенісюк — член камітэта камсамола факультэта, адказная за інтэрнацыянальнае выхаванне студэнтаў. Што і казаць, складаны ўчастак работы даверылі ёй таварышы. Ведалі: дзяўчына яна не з палахлівых, справіцца. І Таня стараецца апраўдаць давер. У пачатку года камітэт камсамола заключыў дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж камсамольскай арганізацыяй геафака і кубінскім зямляцтвам. І цяпер ні адно мерапрыемства на факультэце не праводзіцца без удзелу юнакоў і дзяўчат з Вострава Свабоды.*

*Гэта яе сёння: выдатная вучоба і актыўная грамадская пазіцыя. І ў будучым яна — упэўнен! — не здрадзіць свайму шляху. Наперадзе яе чакае шмат цікавага — ёй толькі дваццаць. Таня Дзенісюк — на парозе сталага жыцця. У добры час, Таня!*

А. ФАМІЧОЎ.



ТЫ ЗАПІСАЎСЯ Ў КАМУНІСТЫЧНЫ?

## ПОБАЧ І КРЫХУ НАПЕРАДЗЕ

НЕКАЛЬКІ ДЗЁН назад я сустрэў знаёмага — студэнта мехмата. Мінулым летам ён, як і я, працаваў піянерскім важатым у лагеры ЦК ЛКСМБ «Зубронак». Пачуўшы, што я — камандзір атрада важатых, ён сказаў:

— Не разумею, як можна другое лета запар ехаць у гэты «Зубронак».

— Чаму ж? — пацікавіўся я.

— Дык там жа амаль нічога не плацяць.

— Камуністычнаму атраду — зусім нічога.

— Ну, гэта проста смешна. Калі ты і сфарміруеш гэты атрад, дык толькі з якіх-небудзь першакурснікаў. Дзяцінства ўсё гэта, павер, дзяцінства.

Размова наша на гэтым і закончылася. Я адчуў, што гаварыць пра тое, што атрад выязджае на тры месяцы, здаўшы раней частку экзаменаў, проста не мае сэнсу. Аднак кароткая гутарка ва універсітэцкім калідоры стала падставай для разважанняў.

Што гэта такое — камуністычны атрад? Ці не занадта смела выносіць у назву такое да многага абавязваючае слова? Так, байцы камуністычных атрадаў не атрымліваюць грошай. Іх пералічваюць у Фонд міру, у Фонд дапамогі народам, якія змагаюцца супраць імперыялістычнага і каланіяльнага прыгнёту, у фонды будаўніцтва новых гарадоў, помнікаў героям рэвалюцыйнай барацьбы. Але, думаецца, гэта не галоўнае. Найбольшую важнасць у камуністычным атрадзе набываюць змест і характар працы, настрой, думкі, пачуцці байцоў.

У гэтым годзе ўпершыню ва універсітэце фарміруецца летні камуністычны атрад важатых «Юнацтва». Здаецца, слова «ўпершыню» тут непрыймальна — усё гэта ўжо было: і пералічванне атрыманых грошай у Фонд міру, і летнія педагагічныя атрады. Але цяпер мы спрабуем аб'яднаць усе сілы з мэтай працаваць больш інтэнсіўна, цікава, творча. Пытанне аб «прафесіі» атрада было вырашана адразу. Безумоўна, работа з піянерамі. Праца, якая патрабуе бязмежнай фантазіі, самаадданасці, шчырасці, смеласці. Праца, дзе нельга сфальшывіць, нельга лічыць час да заканчэння працоўнага дня. Праца, найбольш ганаровая і складаная, — выхаванне чалавека.

Камуністычны атрад важатых — гэта цяжкая праца ўсё лета. Нельга абяцаць байцам якіх-небудзь асаблівых благ, ці адпачынку на беразе возера Нарач. Але з упэўненасцю можна сказаць: тыя, хто паедзе з намі, атрымаюць такую магчымасць праверыць сябе, якой ім не прадставіцца ні ў якім іншым месцы.

Кіраўнікоў у піянерскага важатага шмат: камандзір атрада, старшы піянерскі важаты, начальнік дружыны, адміністрацыя лагера... Але калі працуеш з дзецьмі, ні адзін кіраўнік не падзеліць з табой адказнасць за тое, чым жыве 30 дзён лагернай змены піянерскі атрад. Затое радасць пасля кожнага, няхай нават самага маленькага, поспеху не параўнальная ні з чым, таму што ты дорыш яе тым, для каго піянерскі важаты — «побач і крыху наперадзе». Дзеля гэтага можна працаваць тры такія кароткія месяцы лета.

У гэтым годзе «Юнацтва» будзе складацца з дванаццаці юнакоў і дзяўчат. Заявы ад тых, хто жадае выпрабаваць сябе на педагагічнай працы, прымаюцца ў камітэце камсамола фізічнага факультэта. Атрад будзе фарміравацца шляхам конкурснага субяседавання з удзелам адміністрацыі «Зубронка», прадстаўнікоў камітэта камсамола БДУ, ЦК ЛКСМБ. Арганізоўваецца таксама і вучоба байцоў атрада. Школы піянерскага работніка будуць працаваць у красавіку і маі.

С. ДАБРЫНЕЎСКІ,
камандзір атрада.

СТУДЭНЦКІЯ КАНТАКТЫ

## У ГОСЦІ ДА КАЛЕГ

ДАЎНО ІСНУЮЦЬ цесныя сяброўскія сувязі паміж факультэтамі журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна і Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Сяброўскія сувязі — гэта прыезды да будучых калег, абмен вопытам, выступленні на навуковых канферэнцыях, знаёмства з Кіевам і Мінскам. Гэта мноства незабыўных сустрэч, песень пад гітару і гарачых спрэчак. Нарэшце, гэта цёплыя ўсмешкі, шмат кветак і радасці. Студэнцтва, кажуць, усюды аднолькавае: вясёлае, шчаслівае сваёй маладосцю.

У гэтым годзе мы першымі наведалі сваіх даўніх добрых знаёмых. Прыветна і радасна сустракаў сваіх гасцей прыгажун-Кіеў. І зноў бясконцыя размовы, пытанні. Што змянілася з таго часу, як мы не бачыліся? Што хвалюе? Чаго ўдалося дасягнуць? Праблемы, задачы...

З мэтай абмену навуковым вопытам было наладжана пасяджэнне кафедры стылістыкі факультэта журналістыкі. Нашы студэнткі Наташа Антановіч, Ліля Навіцкая, Люда Сакалова пазнаёмілі аўдыторыю са сваімі работамі па творчасці Я. Коласа, Я. Купалы, Р. Барадуліна. Кіяўляне прапанавалі ўласныя даследаванні ў галіне стылістыкі. Тут выявілася зацікаўленасць пачынаючых журналістаў да нацыянальнай культуры, літаратуры суседняга народа.

А. ДРАГУН.

# Разам — дружная сям'я

### ПАРТРЭТ ГРУПЫ

**Хто з нас не ведае жартаўлівай песенькі: «Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела»! Але не спяшайцеся, давайце паразважаем разам, у чым сапраўдная прыгажосць студэнцкага жыцця: у тым, што, як спяваецца ў той жа студэнцкай песні, «дзень мы прагулялі, ноч пратанцавалі і цяпер не ведаем ні бум-бум»! Або ў любві да будучай прафесіі, захопленасці вучобай, у актыўнай жыццёвай пазіцыі, калі да ўсяго ёсць справа!**

АДНЫ з іх паступілі ва універсітэт адразу пасля школы. Другім нямала карысці дала папярэдняя работа на прадпрыемстве, вучоба на падрыхтоўчым аддзяленні. Там яны трымалі свой першы экзамен на годнасць чалавечую і прафесіянальную, на таварыскасць, уменне жыць інтарэсамі калектыву. А цяпер гэтыя хлопцы і дзяўчаты — трэцяя група другога курса гістарычнага факультэта.

Яны цяпер лічаць, што іменна на другім курсе да многіх з іх прыйшло канчатковае разуменне правільнасці выбранага шляху. А пры паступленні на гістфак, калі быць шчырым, некаторых захаплялі толькі прэстыж будучай прафесіі і жаданне акунуцца ў вясёлае студэнцкае жыццё, аб якім так цікава расказвалі старэйшыя сябры. І вось, нарэшце, — вучоба. Яны ўключыліся ў агульны вучэбны рытм, імкнуцца не адстаць ад іншых. І толькі на другім курсе, калі за плячыма засталіся дзве паспяхова (ці не вельмі ўдала) здадзеныя сесіі, калі яны ўжо добра адчулі радасці і турботы студэнцкага лёсу, настаў час сур'ёзна ацаніць свой выбар. І амаль усе зразумелі, што ён быў правільным. Але двое з групы пакінулі універсітэт. Лепш своечасова зразумець, што будучая спецыяльнасць не па душы, што дарэмна траціць час нельга.

«Выпадковых студэнтаў» цяпер у трэцяй групе няма. Усе зацікаўлены вучобай, усе гараць жаданнем адкрыць нешта сваё, высветліць яшчэ адну невядомую старонку гісторыі роднага краю. Гэта пацвердзіла і летняя археалагічная практыка. Раскопкі праводзілі ў вёсцы Заполле, што ў Рагачоўскім раёне. Уяўляеце, адкідваеш пласт зямлі — і раптам бачыш рэчы, якія належалі чалавеку эпохі неаліту. Вельмі хочацца даведацца, як ён жыў, чым займаўся...

Чарговыя заняткі ў іх раскладзе — семінар па гісторыі СССР. Група ў поўным саставе. Нецярпліва чакае новага выкладчыка. Таму, калі я ўвайшла, усе дружна падхапіліся і заціхлі. І я разгубілася — няўжо прынялі за выкладчыцу? Даведаўшыся, што я студэнтка журфака, ветліва запрасілі ў госці. А потым у адзін голас запыталіся, чаму пісаць збіраюся іменна пра іх. «Звычайная ж група, нічым не вызначаецца...». Пажартавала: маўляў, іх стараста, Аляксей Любімаў, стараста ўсяго другога курса. Значыць, і група ў іх павінна быць лепшай. Успрынялі ўсур'ёз і сталі разам гаварыць пра Аляксея.

— Душа нашага курса, усё разумее, заўсёды дапаможа, заступіцца, калі трэба, — крычаць з «галёркі».

— Яшчэ б, армейская загартоўка, разумець трэба! — дапаўняюць былыя выхаванцы падрыхтоўчага.

— І вучыцца добра, — ціха дадае нехта.

Але таго, аб кім гаварыліся гэтыя цёплыя словы, у той раз так і не давялося пабачыць. Для Аляксея гэта быў дзень, пэўна, самы шчаслівы ў жыцці: на свет паявіўся маленькі чалавечак — яго дачка. У яе ўжо імя ёсць — Настасся. Настасся Аляксееўна. Прыгожа, праўда? Усёй групай абмяркоўвалі гэтае імя. І нарэшце зацвердзілі.

Гаворка зайшла пра іншых «славутых» людзей групы. Гэта Ігар Пракаповіч, Люда Рэчыц, Люда Дабржанская. Вядома, выдатнікі. Але да таго ж і цудоўныя людзі. Пытаюся ў іх: «Што значыць вучыцца выдатна?»

— Рыхтавацца да семінараў сістэматычна, не адкладваючы да сесіі, — сказаў Ігар Пракаповіч.

— Нядобрасумленна адносіцца да вучобы той, у каго адсутнічае пачуццё ўласнай годнасці, — лічыць Людміла Дабржанская.

— Перад паступленнем у ВНУ чалавек павінен абавязкова папрацаваць, каб канчаткова вызначыць для сябе: хочацца яму вучыцца далей, ці хопіць тых ведаў, якія дала сярэдняя школа. Да таго ж, праца выхоўвае ўседлівасць і ўменне даражыць часам — вельмі карысныя рысы, патрэбныя студэнту, — меркаванне праформа групы Віктара Кухарчука.

А потым неяк само па сабе паўстала пытанне: чаму часта бывае так, што школьныя медалісты дрэнна займаюцца ў ВНУ? Людміла Рэчыц наконт гэтага сказала вось што: «Калі першая мая спроба паступіць на гістфак аказалася беспаспяховай, я вельмі злавалася на сябе і занадта патрабавальных выкладчыкаў. Год працавала на заводзе. І цвёрда верыла: абавязкова стану студэнткай гістфака. Проста не ўяўляла сябе, былую медалістку, па-за сценамі універсітэта. І вось, нарэшце, ужо другі курс. Пэўна таму, што шлях мой у ВНУ быў цяжкім, я так старанна вучуся. І крыўдна бачыць студэнтаў, якія робяць гэта без захаплення.

— А як потым у школе скажаш сваім вучням: «Сорамна не ведаць урока!», калі сам вучыўся «так сабе»? — працягвае думку аднакурсніцы Ігар Пракаповіч.

Хлопцы і дзяўчаты разгарачыліся, спрачаюцца, смяюцца. А я гляджу на іх і думаю вось аб чым: калі яны з такім запалам будуць імкнуцца зразумець ісціну чалавечага быцця, актыўна вырашаць складаныя праблемы вучобы, зноў і зноў адкрываць для сябе захапляючы цуд сівой гісторыі, то не спатрэбяцца ім бяссонныя ночы перад экзаменамі, не будзе ў іх сапсаванага настрою ад нешчаслівага білета, а крыху пазней — разгубленасці перад дапытлівымі вачыма сваіх вучняў.

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

---

### ● НА ТЭМЫ МАРАЛІ

# ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ ВЫПАДКОВАСЦІ?

**Яны вучыліся ў адной школе, у паралельных класах. Потым абедзве паступілі на адзін і той жа факультэт, трапілі ў адну групу. Нарэшце, жылі ў адным пакоі інтэрната, пакуль... Пакуль не здарылася тое, ад чаго іх дарогі павярнулі ў розныя бакі.**

ЗДАРЫЛАСЯ... І зноў няўмольная філасофія жыцця патрабуе дакладнага размеркавання катэгорый выпадковасці і заканамернасці. Дык гэта была выпадковасць?

**«Я цэлы год жыла ў інтэрнаце разам з Таццянай Шпак і Людай Кувека. Рознае здаралася за гэты час: сутычкі, невялікія спрэчкі. І часцей за ўсё канфлікты былі з Кувека, але пра Люду я не магла нічога дрэннага падумаць (маю на ўвазе гісторыю са знікшымі грашыма), гэта чалавек прынцыповы, правільны». (З тлумачальнай запіскі Людмілы Бараноўскай).**

Баявая, энергічная, яна лёгка сыходзілася з людзьмі. Нейкая адкрытасць і ўважлівасць вабілі да яе, не ўзнікала перасцярогі, адчування, што цябе не зразумеюць. З большасцю знаёмых студэнтаў групы, патока ў Таццяны былі роўныя таварыскія адносіны. Яе лічылі вясёлай, гаваркой, не пазбаўленай пачуцця гумару. Не было самай блізкай сяброўкі? Дык ці мала такіх людзей? Значыць, не знайшла яшчэ, ці патрабаванні да сяброўства занадта высокія прад'яўляла. Не прымала ўдзелу ў грамадскім жыцці? Але колькі тых актывістаў у групе, на пальцах пералічыць можна. Непрыемныя адносіны з Людай Кувека, былой аднакласніцай? А чаму яны абавязкова павінны быць прыемнымі? Адзін з псіхалагічных тэстаў змяшчае пытанне на ісціннасць: ці ўсе вашы знаёмыя падабаюцца вам? Сцвярджальны адказ — няпраўда. У кожнага чалавека ёсць непрыемныя знаёмствы.

Але калі ўсё пачалося? Можа, тады, калі Таццяна Шпак, прыехаўшы з дому, пераказвала брудныя і малаверагодныя гісторыі пра Люду Кувека, складзеныя злымі вясковымі языкамі? А магчыма і тады, калі катэгарычна адмовілася падмесці падлогу ў пакоі і перамыць посуд. **«На яе нельга было злавацца. Вясёлы нораў, уменне згладзіць нейкія шарахаватасці ва ўзаемаадносінах рабілі сваю справу. І міжвольна мы даравалі ёй усё». (З размовы з Інай Ефімовіч, якая таксама жыла ў адным пакоі з Т. Шпак).**

Яны даравалі, нават калі даведаліся, што Шпак перахоплівае і чытае іх лісты (шматкі якіх знаходзілі потым на падлозе). Хацелі сур'ёзна пагаварыць з ёй, але размовы чамусьці не атрымалася. Было проста агідна. Не верылася, што Таццяна можа зрабіць такое.

Дабрата і мяккасць дзяўчат аднак не ўзбуджалі добрых намераў у душы Шпак. Знешне яна заставалася такой жа гаманлівай, вясёлай і непасрэднай. Але як разгадаць загадзя тое нядобрае, што нябачна для чужога вока прыгнятае чалавека, пакуль не выплеснецца ўжо непапраўным...

**«Чацвёртага верасня быў зроблены крадзёж у інтэрнаце № 6 на суму 100 рублёў.**

**У камітэт камсамола паступіла запіска ад Т. Шпак, у якой яна пераконвае, што крадзёж не рабіла. Ленінскі РАУС даў заключэнне, што крадзёж быў зроблены». (Выпіска з пратакола пасяджэння камітэта камсамола ФПМ ад 29 лістапада 1982 года).**

Калі дзяўчаты былі на занятках, яна прыйшла ў пакой і... Чаму? Чаго ёй не хапала?

**«Таццяна ніколі не вызначалася беражлівасцю ў сэнсе матэрыяльных сродкаў. Грошы яна траціла часам бяздумна, бо ніколі не адчувала недахопу ў іх. І наогул, сярод нас яна была самай забяспечанай, бацькі ёй ні ў чым не адмаўлялі». (З размовы з Інай Ефімовіч).**

Навошта ёй былі тыя 100 рублёў? Каб купіць спадніцу і букет кветак. Кветкі пасля мярзотнасці, пасля таго, як пераступлена вядомая мяжа маралі, як згублена часціца чалавечнасці... Шпак разыгрывала камедыю з заведама трагічным канцом. Аб прызнанні не магло быць і сказу. Наадварот, тут жа, на хаду, складаліся неверагодныя гісторыі, адна мана цягнула за сабой другую. Яна казала, што не прыходзіла ў інтэрнат, — вахцёр і дзяжурныя бачылі яе там; у яе як быццам не было ключа ад пакоя,— ключ аказаўся ў сумцы; казала, што даўно прывезла спадніцу з дому,—побач з пакупкай ляжаў чэк універмага з адпаведнай датай.

Справай заняліся следчыя органы. **«Перад тым, як ісці чарговы раз у міліцыю, мы сказалі Шпак, што сведкі пацвердзілі: ў інтэрнаце яна была, у пакой заходзіла. Таму лепш прызнацца адразу». (З размовы з Інай Ефімовіч).** Махлярка выкрыта, але ёй не хапае смеласці сказаць праўду пра свой падман. Вось што піша Таццяна ў тлумачальнай запісцы: **«Яны (Кувека Л., Бараноўская Л., Ефімовіч І.) пачалі вымагаць з мяне прызнанне. Гэта цягнулася, пакуль я зусім не змучылася... Нервы не вытрымалі. Калі апрытомнела, яны сказалі, што я прызналася і цяпер мне нічога не застаецца, як аддаць ім грошы... Сказалі б мне тады зняць сукенку, я б і гэта зрабіла...».**

Паверыць, увогуле, можна. Стан сапраўды стрэсавы, і дзеянні ў такім выпадку могуць быць самымі разнастайнымі. Але ці можна верыць чалавеку, які сам губляецца сярод сваёй маны? **«Ленінскі РАУС даў заключэнне, што крадзёж быў зроблены Шпак Таццянай». (З пратакола пасяджэння камітэта камсамола ФПМ).**

Прайшло паўгода. Вельмі мала для таго, каб забыць пра гэту гісторыю. Ды і ці можна яе забыць, ці варта? Група вынесла прысуд: за амаральныя паводзіны выключыць студэнтку II курса Таццяну Шпак з радоў камсамола. Тое ж рашэнне прынята пасяджэннем камітэта камсамола ФПМ.

Шпак больш не студэнтка. Тады ж, у верасні, яна падала заяву ў дэканат з просьбай вярнуць дакументы. Улічваючы наяўнасць акадэмічных запазычанасцей і зроблены ўчынак, Т. Шпак была выключана з універсітэта.

Вінаватая. А ці лічыць Таццяна сябе вінаватай? Дасланыя ў камітэт камсамола факультэта тлумачальная запіска Шпак і ліст яе цёткі сведчаць, што яны засталіся пры сваім меркаванні: Таня нічога дрэннага не зрабіла, ва ўсім вінаваты плеткары і паклёпнікі.

Дык чыя ж тут памылка, чаму ніхто не пераканаў Шпак у амаральнасці яе паводзін? Даказаць усім вінаватасць вінаватага і не даказаць толькі яму самому?! Але хто склаў цагліны той сцяны, якой Таццяна адмежавалася ад агульнапрынятых жыццёвых правілаў? Бацькі задавальнялі кожны яе капрыз. Сакурсніцы не адважваліся сказаць у вочы горкую праўду. Бадай, адна Люда Кувека не саромелася, затое і была ворагам «нумар адзін».

...І ўжо нічога таго не вернеш. Не перасцеражэш. Яно было, яно лягло чорнай плямай на сумленне Тані, яно закружыла, завіхурыла абвінавачваннямі, доказамі, слязьмі і пагрозамі. Цагліна за цаглінай будавалася сцяна. Яна і зараз стаіць нерухома. І зноў няўмольная філасофія жыцця патрабуе дакладнага размеркавання катэгорый выпадковасці і заканамернасці. Дык гэта была заканамернасць?..

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

---



*ВЫВУЧЭННЮ замежнай мовы ўдзяляецца ва універсітэце вялікая ўвага. І гэта не выпадкова: сённяшні студэнт павінен добра арыентавацца ў шырокім патоку грамадска-палітычнай і навукова-тэхнічнай інфармацыі, ведаць аб апошніх дасягненнях сусветнай навукі. Цяпер да паслуг студэнтаў — абсталяваныя на высокім узроўні лінгафонныя кабінеты і класы, лекцыі і заняткі вядуць кваліфікаваныя выкладчыкі.*

*НА ЗДЫМКУ: у лінгафонным кабінеце № 4. Практычныя заняткі па англійскай мове ў студэнтаў IV курса факультэта прыкладной матэматыкі.*

Фота **В. Шачака.**

# Да неба рукой падаць

## ГЕРОІ ЭВЕРЭСТА

*Сёння іх імёны вядомы на ўсіх кантынентах: хутка год, як савецкія альпіністы па самаму складанаму, паўднёва-заходняму схілу ўзняліся на найвышэйшую гару свету — Эверэст. Двое з адзінаццаці ўзыходжвальнікаў — заслужаныя майстры спорту Валерый Хамутоў і Уладзімір Пучкоў — выступілі нядаўна перад студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта.*



КАЛІ 9 МАЯ Валерый Хамутоў ступіў на вяршыню Эверэста, неба над галавой было на здзіўленне блакітным. Не, гэта была не ілюзія, не аптычны падман — гэта быў трыумф перамогі. Вышэй хмар яно заўжды такое. Ля яго ног ляжала грозная ўчора Сагарматха — Уладар Неба (так завуць Эверэст непальцы), Джамалунгма — Багіня Маці Зямлі (так звяртаюцца да гары жыхары Тыбета). Перамога ў Дзень Перамогі! І старшы групы не ўтрымаўся, каб не павіншаваць са святам таварышаў, што былі побач, на вяршыні, і — па радыё — тых, хто застаўся ў базавым лагеры.

...Яны прыйшлі ў «спорт мужных» амаль адначасова. Хамутоў у 1963 годзе, калі займаўся ў Харкаўскім політэхнічным інстытуце, Пучкоў запісаўся ў секцыю альпінізму МВТВ імя Баўмана на два гады пазней. Ці марылі яны тады ўзысці так высока? Напэўна, марылі. Бо хто з нас не імкнецца мець у жыцці свой Эверэст? Для альпіністаў жа вышыня 8848 метраў — рэкорд рэкордаў. На іх шляху былі напружаныя трэніроўкі, горы Каўказа і сямітысячнікі Паміра. Але гэта, як кажуць, уступ у прыгожую паэму гор. Галоўная вяршыня чакала наперадзе.

Дваццаць гадоў і сорак пяць дзён... Столькі працягвалася іх узыходжанне на Эверэст. Дваццаць гадоў і сорак пяць дзён... Навошта? Дзеля чаго? Каб на вышыні 8848 метраў уздыхнуць на поўныя грудзі. Але ж тут, пад гэтым ласкавым на першы погляд небам, неабходна берагчы кісларод — ён яшчэ спатрэбіцца пры спуску. Дзеля славы? Ды яна бязлітасная, гэтая слава: толькі ў час іх узыходжання ахвярамі дзікіх скал і бяздонных цяснін сталі два англійскія спартсмены і амерыканская альпіністка.

У час сустрэчы я спытаў аб гэтым у Пучкова.

— Горы паважаюць смелых, моцных духам і целам. І ніколі не даруюць падман, подласць, баязлівасць. Тым больш Эверэст. Чалавек ідзе на яго штурм, каб праверыць свае магчымасці, сваю сілу. Самасцвярджэнне — вось што вядзе яго. Ці думаеш аб узнагародзе, аб славе, калі любы неасцярожны крок, неразважлівы рух можа закончыцца трагедыяй. Ці думаў аб славе новазеландзец Эдмунд Хілары, калі у 1953 годзе першым пакарыў «трэці полюс»? Або Рэйнгальд Меснер, у якога на рахунку сем васьмітысячнікаў з чатырнаццаці і брат якога, таксама альпініст, загінуў у гарах? І калі савецкія альпіністы выбралі самы складаны шлях у неба і паспяхова прайшлі яго, то гэта яшчэ раз гаворыць аб высокім класе ўзыходжвальнікаў, аб папулярнасці гэтага віду спорту ў нашай краіне.

Ён быў нялёгкім, часам рызыкоўным, гэты шлях да неба. На кожным кроку альпіністаў падпільноўвалі глыбокія цясніны, стромкія скалы, ледзяныя наплывы. Больш месяца на схілах гары бушавала непагадзь: маразы змяняліся шквальнымі вятрамі, вятры — снегападамі. Не спраўдзіліся надзеі і на перадмусонны перыяд. Спецыялісты — і савецкія, і замежныя — лічаць, што ў такіх умовах упэўненасць у поспехах экспедыцыі была мінімальнай.

Валерый Хамутоў, Уладзімір Пучкоў і Юрый Голадаў былі апошнімі, хто ўзняўся на вяршыню Эверэста — снежны купал памерам у некалькі квадратных метраў. Яшчэ аднаго члена групы — Аляксея Маскалёва — падпільнавала няўдача: ён упаў у трэшчыну і быў вымушаны застацца ў лагеры. Сёння можна гаварыць, што Хамутову, Пучкову і Голадаву было лягчэй — першыя зрабілі сваю справу. Аднак нельга не пагадзіцца і з тым, што група Хамутова «фарсіравала» апошні адрэзак шляху ў 348 метраў ад пятага лагера да купала за рэкордна кароткі прамежак часу — недзе крыху больш гадзіны.

На адно са шматлікіх пытанняў студэнтаў Валерый Хамутоў адказаў так:

— У гарах неабходна ведаць і ўмець амаль усё, быць і метэаролагам, і ўрачом, і кінааператарам, і... Ды толькі вышэй за ўменне, за веды і навыкі цэняцца тут узаемавыручка, гатоўнасць у любы момант прыйсці на дапамогу таварышу і, калі таго патрабуе сітуацыя, адмовіцца ад уласнай мэты. Так паступіла, напрыклад, звязка Ільінскі — Чэпчаў, калі іх фізічныя сілы і кісларод спатрэбіліся Валерыю Хрышчатаму і Казбеку Валіеву.

Альпіністы прывезлі з сабой ва універсітэт два фільмы: адзін — пра падрыхтоўку да экспедыцыі, другі — пра сам шлях да вяршыні. Кожны, хто бачыў іх, не перастае здзіўляцца: спартсменам давялося вытрымаць праверку ў баракамеры ціскам і кіслародным недахопам, штурмаваць вертыкальныя скалы, бегаць кросы з цяжкімі рукзакамі за спіной, прайсці іншыя фізічныя і медыка-біялагічныя тэсты. Усё гэта, безумоўна, спатрэбілася ў гарах. Аднак у найбольшай пашане ва ўдзельнікаў экспедыцыі былі якасці, аб якіх гаварылася вышэй. Якасці агульначалавечага плана, рысы калектыўныя. Хіба можна ўявіць экспедыцыю без яе кіраўніка, доктара фізіка-матэматычных навук Яўгена Ігаравіча Тама, без яго патрабавальнасці і прынцыповасці. Без урача групы Света Пятровіча Арлоўскага, які рабіў усё магчымае і немагчымае, каб мэта экспедыцыі стала рэальнасцю. Без кінааператара Уладзіміра Шопіна, які разам з мясцовым жыхаром — шэрпам — дасягнуў чацвёртага прамежкавага лагера і паставіў там палатку. Ён ведаў: ззаду ідуць таварышы. Без тых, чые імёны сёння невядомы чытачу, але хто прыняў самы непасрэдны ўдзел у штурме: медыкаў, вучоных, інструктараў, рабочых, што рыхтавалі альпіністам амуніцыю, шылі палаткі... І атрымаецца, што разам з адзінаццаццю на Эверэсце пабывалі і яны.

— І нават той, хто хваляваўся за нас, жадаў нам перамогі, — дадае Валерый Хамутоў.

...Экспедыцыя закончылася паспяхова. Савецкія альпіністы яшчэ раз пацвердзілі сваё майстэрства, уменне быць наперадзе. Штурм Эверэста быў нечым падобны на шахматную гульню, дзе кожны памылковы ход мог абярнуцца паражэннем, але ўжо не для аднаго спартсмена, а для цэлай каманды. І тым больш радасна адчуваць, што матч выйгран, што яго ўдзельнікамі былі і нядаўнія госці універсітэта Валерый Хамутоў і Уладзімір Пучкоў.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**




**На здымках: В. Хамутоў** (злева) і **У. Пучкоў** у час сустрэчы; аўтограф з пажаданнем чытачам газеты.

Фота **В. Шачака.**

# ДЫЯПАЗОН ДЗЕЙНАСЦІ

## НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ

**Адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя народных кантралёраў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, у рабоце якой прымалі ўдзел прадстаўнікі парткома і рэктарата, а таксама першы сакратар Маскоўскага РК КПБ Б. А. Саўчанка і намеснік начальніка аддзела навукі, культуры і аховы здароўя камітэта народнага кантролю БССР І. Ф. Шасцярнёў. Са справаздачным дакладам выступіла старшыня камітэта народнага кантролю універсітэта А. С. Каспяровіч. Прапануем вытрымкі з даклада.**

РАБОТА КАМІТЭТА народнага кантролю праводзілася ў адпаведнасці з планам, складзеным на каляндарны год. У плане прадугледжвалася арганізацыя мерапрыемстваў (пасяджэнні КНК, мерапрыемствы па забеспячэнню галоснасці, семінары-нарады старшынь груп НК падраздзяленняў), правядзенне праверак, заняткаў у школах народных кантралёраў, кантроль за выкананнем пастаноў КНК і вышэйстаячых органаў НК. Пры складанні плана ўлічваліся прапановы парткома і рэктарата, груп НК падраздзяленняў. План абмяркоўваўся на пасяджэнні КНК і ўзгадняўся на бюро парткома. За справаздачны перыяд аддзеламі камітэта народнага кантролю праведзены 43 праверкі, вынікі 37 з іх заслуханы на пасяджэннях камітэта.

**ПА АДДЗЕЛУ КАНТРОЛЮ ЗА ВУЧЭБНАЙ РАБОТАЙ: аб рабоце вучэбна-дапаможнага персаналу на хімічным, геаграфічным і біялагічным факультэтах; аб правільнасці заліку абітурыентаў на факультэты з высокім прахадным балам; аб выніках правільнасці назначэння стыпендый студэнтам; аб выніках праверкі эфектыўнасці выкарыстання творчых водпускаў супрацоўнікамі; аб выніках праверкі кантролю і ўліку работы сумяшчальнікаў на механіка-матэматычным, юрыдычным і геаграфічным факультэтах і на кафедры фізічнага выхавання; аб выніках наведвання паточных лекцый на шэрагу факультэтаў.**

**ПА АДДЗЕЛУ КАНТРОЛЮ ЗА НАВУКОВАЙ РАБОТАЙ: аб эфектыўнасці ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай рабоце на фізічным, радыёфізічным, біялагічным і хімічным факультэтах; аб выніках праверкі эфектыўнай дзейнасці інфармацыйных і патэнтных службаў БДУ імя У. І. Леніна па ўкараненню вынікаў НДР у народную гаспадарку; аб выніках праверкі выкарыстання абсталявання ў НДІ ФХП І НДІ ПФП; аб выніках праверкі эфектыўнасці навуковых даследаванняў па міжвузаўскаму супрацоўніцтву з замежнымі ВНУ; аб рабоце СКТБ з доследнай вытворчасцю.**

**ПА АДДЗЕЛУ МАТЭРЫЯЛЬНА - ТЭХНІЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ І БЫТУ: кожны год — праверкі гатоўнасці да работы ў зімовых умовах вучэбных карпусоў і інтэрнатаў; аб рабоце сталовых і буфетаў, стала заказаў, паліклінікі.**

**ПА АДДЗЕЛУ БЕРАЖЛІВАСЦІ І ЗАХАВАНАСЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ МАЁМАСЦІ: аб эканомным расходаванні бензіну і гаруча-змазачных матэрыялаў; аб эканомным расходаванні электраэнергіі, аб стане працоўнай дысцыпліны.**

З гэтага няпоўнага пераліку бачна, што кола пытанняў шырокае. Яны ахопліваюць усе сферы дзейнасці універсітэта.

Па кожнаму з разглядаемых пытанняў прымаліся канкрэтныя пастановы, якія перадаваліся ў рэктарат і адпаведныя службы для прыняцця мер. Па выніках праверак выдадзены тры загады і распараджэнні па універсітэту, заслуханы тлумачэнні 8 кіраўнікоў падраздзяленняў, па патрабаванню камітэта народнага кантролю два камуністы атрымалі партыйныя спагнанні. Але галоўную сваю задачу КНК бачыць не ў пакаранні, а ў папярэджанні парушэнняў і ў паступовым іх выкараненні.

Пры камітэце народнага кантролю створана юрыдычнае бюро, якое ўзначальвае кандыдат юрыдычных навук А. У. Баркоў. Адной з форм яго дзейнасці з'яўляецца кантроль за работай з пісьмамі і прыёмам грамадзян. Праверкі, якія праводзіла бюро, паказалі, што ў БДУ імя У. І. Леніна вядзецца дакладная рэгістрацыя пісем, скаргаў і заяў супрацоўнікаў, якая дапамагае ажыццяўляць кантроль за тэрмінамі праходжання і характарам пісем, заяў і скаргаў ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта.

Камітэт народнага кантролю працуе ўжо два гады. Яны з'явіліся гадамі станаўлення якасна новай грамадскай арганізацыі ў адпаведнасці з законам аб НК у СССР, якім дадзены вялікія правы. Разам з тым узрасла патрабавальнасць да якасці работы КНК і яго няштатных аддзелаў, да выбару і якасці праверак, паляпшэння арганізацыі кантролю за выкананнем прымаемых рашэнняў.

Кантроль па свайму характару мае крытычную накіраванасць і часта закранае тых, каго правяраюць, маральна і матэрыяльна. Дзеянні народнага кантролю не ўсім прыходзяцца па густу. Упэўненасць і сілу для сваёй работы КНК чэрпае ў партыйным кіраўніцтве. Партком універсітэта ўдзяляе вялікую ўвагу рабоце камітэта народнага кантролю. Гэта стварае добрую аснову для таго, каб павысіць баяздольнасць народнага кантролю, зрабіць яго яшчэ больш актыўным памочнікам партыйнай арганізацыі ў барацьбе за выкананне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, майскага (1982 г.) і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС.

Канферэнцыя закончылася выбраннем новага саставу КНК, старшынёй якога зноў выбрана А. С. Каспяровіч.

**Н. АЛЕГАВА.**







# ДАЙЦЕ ДАРУЧЭННЕ!

ІШЛО ЧАРГОВАЕ пасяджэнне камітэта камсамола факультэта. Ужо ў трэці раз прыадчыняліся дзверы і камітэтчыкі заўважалі ў іх рыжую галаву Паўла Бабылькова. У апошні раз яна затрымалася даўжэй, і сакратар камітэта камсамола Вікторыя Прынцыповая паспела выкрыкнуць:

— Ты мо што хацеў, Павел?

Галавы ў дзвярах як і не было. Але праз некалькі хвілін яны расчыніліся зноў, і ў камітэт упэўненым крокам увайшоў Бабылькоў.

— А як жа! Я хацеў... — пачаў ён. — Тут такая справа атрымліваецца. На нашым курсе ў кожнага ёсць камсамольскія ці грамадскія даручэнні, а ў мяне няма. Я што, горш за іншых? Прашу даверыць мне адказную справу.

— А ты звяртаўся з гэтым да камсорга курса? — насмешліва запытала Яніна Матылькова.

— А як жа, — з крыўдай у голасе загаварыў Бабылькоў. — Камсорг сказаў, што ўсе даручэнні ўжо разабралі, таму мне не хапіла. Параіў звярнуцца ў камітэт.

— Чым бы ты хацеў займацца? — не адставала Матылькова.

— Чым трэба, тым і буду, — адрэзаў Павел, крануўшы рукой гальштук.

— Можа табе што-небудзь падабаецца? — старалася дапытацца Матылькова.

— Мне ўсё падабаецца! — тым жа тонам вымавіў Бабылькоў.

— Добра, добра! — уключылася ў размову намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце Людміла Язычкова. — Нам у аркестр патрэбен інструктар. Можа, Павел, паспрабуеш папрацаваць?

— Што вы! Не, таварышы! У мяне арганізатарскія здольнасці адсутнічаюць. Нічога не атрымаецца, на сто працэнтаў упэўнены! Адным словам, не!

— А можа ў рэдкалегію да нас пойдзеш? — запытаў Сяргей Зубцоў, рэдактар насценгазеты.

— Не-е-е! Гэта не па майму густу. Маляваць я не ўмею, вершы не пішу. Не спраўлюся з гэтым!

— А можа штабу працоўных спраў будзеш дапамагаць фарміраваць будатрады, напрыклад? — спытала камандзір штаба Алена Кароткая.

— З гэтым нічога не атрымаецца. У будатрад я не еду. — у мяне хранічны насмарк, гіпадынамія, танзіліт, гастрыт...

— У хор пойдзеш спяваць? — перабіваючы Бабылькова, узрадавана запытала адказная за культурна-масавую работу Раіса Ноткіна.

— Голасу няма! — катэгарычна запярэчыў Бабылькоў. — Калі спяваць пачынаю, дык нават каты палохаюцца, хвасты дыбам ладымаюць.

— Тады рабочым сцэны ў наш тэатр? — не здавалася Ноткіна.

— Жартуеце, ці што? У мяне акцёрскіх даных няма: дэкламую слаба, танцаваць не ўмею.

— А табе і не трэба нічога такога рабіць! — узрадавалася Раіса Ноткіна. — Будзеш касцюмы да спектакляў рыхтаваць, дэкарацыі ўстанаўліваць.

— Ой, што вы, з гэтым мне тым больш не справіцца, — сказаў Бабылькоў і кіславата ўсміхнуўся.

— Тады нічога ў нас з табой не атрымаецца, — запярэчыла сакратар камітэта Прынцыповая, якая да гэтага маўчала і сачыла за ходам падзей. — Ты сцвярджаеш, што ні з чым не справішся. Ты сам не ведаеш, што табе трэба!

— А адкуль я даведаюся?! —запыхцеў Бабылькоў.— Ва ўсіх даручэнні ёсць?! Ёсць! Дзе ж мне раскрыць свае здольнасці? Дайце даручэнне, а тады і паглядзім.

— Добра, — сказала сакратар. — Прыходзілі з галоўнага корпуса і гаварылі, што ў цір універсітэта патрабуецца інструктар па стральбе. Пойдзеш, Павел?

— Як вам сказаць, — апраўдваючыся, пачаў Бабылькоў. — У мяне зрок кепскі. Я ўжо забыў, калі вінтоўку ў руках трымаў. Не, можа яшчэ што ёсць?..

І члены камітэта камсамола, абхапіўшы галовы рукамі, пачалі думаць далей...

**А. БЕЛЬСКІ,**
**студэнт філалагічнага факультэта**









**КАТЭГАРЫЧНА ВІНШУЕМ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ З ДНЁМ СМЕХУ!**

## НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

# Адказнасць за злачынства

**Пад рэдакцыяй прафесара І. С. ЦІШКЕВІЧА**

АДКАЗНАСЦЬ за здзейсненае злачынства нясуць не толькі асоба, якая непасрэдна ўчыніла крымінальнае дзеянне, але і ўсе, хто гэтаму так ці інакш садзейнічаў, караецца, усе саўдзельнікі злачынства. Адпаведна з артыкулам І Крымінальнага кодэкса БССР саўдзелам прызнаецца наўмысны ўдзел двух ці больш асоб ва ўчыненні злачынства. У залежнасці ад таго, якая роля належыць саўдзельніку ў ажыццяўленні агульнага злачыннага намеру, артыкул 17 КК вызначае наступныя віды саўдзельнікаў: выканаўца, арганізатар, падбухторшчык і памагаты. Згодна з гэтым артыкулам, выканаўцай прызнаецца асоба, якая непасрэдна здзейсніла злачынства. Арганізатар — хто арганізаваў учыненне злачынства ці кіраваў ім, падбухторшчык — асоба, якая схіліла да злачынства, памагаты — той, хто садзейнічаў учыненню злачынства парадамі, указаннямі або абяцаў схаваць злачынцу і г. д.

Напрыклад, К., А., Л. дамовіліся ўкрасці са склада чатыры аўтамабільныя колы. А. падгаварыў свайго сябра Е. прыехаць на машыне ноччу да склада і расказаў яму аб задуманым. Е. згадзіўся ўдзельнічаць. Ноччу К. і Е. узялі са склада па адному колу, А. — два, а ў гэты час Л. прывёў у парадак склад і, зачыніўшы дзверы, дагнаў астатніх і дапамог несці ўкрадзенае.

У даным выпадку наступае адказнасць за разам здзейсненае злачынства — крадзёж дзяржаўнай маёмасці, хаця кожны з саўдзельнікаў выканаў толькі частку дзеянняў, накіраваных на ўчыненне задуманага злачынства.

Выканаўцай прызнаецца і тая асоба, якая здзяйсняе злачынства чужымі рукамі, выкарыстоўваючы дзеянні малалетніх, не дасягнуўшых узросту, з якога наступае крымінальная адказнасць. Напрыклад, 20-гадовы Б. арганізаваў групу школьнікаў для крадзяжу ў вячэрні час з ларкоў. А. і К. (абодвум па 12 гадоў) здзейснілі некалькі такіх крадзяжоў, у якіх Б. не ўдзельнічаў, але паказваў ім, як і дзе можна красці. А. і К. як малалетнія пад крымінальную адказнасць не падпадаюць. Б. панёс крымінальную адказнасць за ўсе злачынствы як выканаўца іх.

Саўдзельнікі злачынства вызваляюцца ад крымінальнай адказнасці, калі яны своечасова адумаліся і сваімі актыўнымі дзеяннямі дапамаглі органам улады прадухіліць злачынства.

**І. МАМЕДАЎ,**
**студэнт юрыдычнага факультэта, член навуковага гуртка па крымінальнаму праву.**

# СТАНОЎЧАЯ АЦЭНКА

АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА аператыўных камсамольскіх атрадаў дружыннікаў — прафілактычная і выхаваўчая работа сярод падлеткаў. Наш атрад быў арганізаваны ў красавіку 1979 года. Састаў яго — 150 чалавек. Ужо чацвёрты год аператыўны камсамольскі атрад БДУ замацаваны за Маскоўскім раёнам Мінска. У абавязкі атрада ўваходзяць, папершае, пастаянныя дзяжурствы на апорным пункце правапарадку. Патрэбна сказаць, што ў гэтым плане справы ў нас ідуць добра, акрамя тых месяцаў, калі дзяжураць супрацоўнікі навукова-даследчых інстытутаў.

Па-другое, выхаваўчая работа. Зараз на ўліку ў нас знаходзіцца 31 падлетак. За кожным з іх замацаваны шэфы з ліку членаў аператыўнага камсамольскага атрада. Кожны шэф вядзе дзённік, у якім запісвае вынікі сваіх намаганняў. У апошні час у штабе мы афармляем экран уліку работы шэфаў. А раз у тры месяцы кожны з іх трымае справаздачу на пасяджэнні штаба. Мы лічым, што такі падыход стварае нагляднасць у нашай рабоце і павышае яе эфектыўнасць. Канчатковы вынік шэфскай дзейнасці — зняцце непаўналетняга з уліку.

Нядаўна праходзіў V раённы злёт дружыннікаў, на якім былі падведзены вынікі дзейнасці аператыўных атрадаў Маскоўскага раёна. Работа камсамольскага аператыўнага атрада БДУ была ацэнена станоўча.

**П. ВЯНГЛІНСКІ,**
**камандзір аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў універсітэта.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
31 сакавіка 1983 г.
Зак. 597. АТ 04134

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ